ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1988
ЧАЦВЕР
6
КАСТРЫЧНІКА
№ 25(1583)

Беларускі універсітэт

ТЭЛЕТАЙП

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

МІЖВУЗАЎСКАЯ НАВУКОВАЯ

канферэнцыя маладых вучоных-хімікаў закончыла сваю работу. З дакладамі і паведамленнямі выступілі даследчыкі хімічнага факультэта, НДІ ФХП, АН БССР, а таксама вучоныя з Масквы, Кіева, Ужгарада, Новасібірска. У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў канферэнцыі — заканамернасці хімічных рэакцый з удзелам цвёрдых цел.

ЯК ПРАВЕСЦІ ВЫХАДНЫЯ?

Упэўна, гэта пытанне не раз паўставала перад вамі. Даць адказ на яго можа адміністрацыя клуба імя Ф. Дзяржынскага. Тут паклапаціліся аб тым, каб вы мелі магчымасць праводзіць свой вольны час цікава і змястоўна. У суботу і нядзелю вы зможаце быць удзельнікамі (і вельмі жаданымі) вечара адпачынку моладзі. Для вас іграе эстрадны аркестр, дэманструюцца кінафільмы, праводзяцца гульні, конкурсы.

Тым, хто любіць цішыню выставачных залаў, таксама можна прапанаваць нешта новае. У памяшканні Клуба МВА імя У. І. Леніна (вул. Кульман, 14) арганізавана нетрадыцыйная выстаўка візуальнага мастацтва. Дарэчы, тут вы можаце пабываць не толькі ў выхадныя дні (працуе яна з 15.00 да 21.00).

З. МІХНЕВІЧ.

ЧЫТАЧ — ГАЗЕЦЕ

У НАС — ПРАКТЫКА!

— А зараз паспрабуйце... Ну, хаця б вы,— нечакана як раз у мой бок пазірае Галіна Васільеўна. Сапраўды ці то падалося? Набіраю больш паветра, за імгненне паспеўшы «пракруціць» уводзіны, звесткі, лічбы...

— Не-не,— перасцерагаюча падымае руку наш гіднастаўнік,— не трэба многа слоў, пачнём з канкрэтнага...

Здзіўлена азіраюцца рэдкія наведвальнікі. Прызвычаіліся да таго, што ў музеі слухаюць аднаго. У нас паіншаму. У нас — музейная практыка, таму гаварыць павіны ўсе.

Марная трата часу? «Блуканне па падвалах, дзе захоўваюцца музейныя фонды, перапісванне нудных папер», — так лічылі і мы, пачынаючы практыку ў музеі Вялікай Айчыннай вайны. Аднак сустрэліся з кіраўнікамі Галінай Васільеўнай Скарынка і Ірынай Юр'еўнай Варанковай і зразумелі: нас чакае цікавая і творчая работа.

Лекцыі аб праблемах сучаснага музея, экскурсія ў Хатынь і на Курган Славы... У час наведвання Дома-музея I з'езда РСДРП, дзе адбылася сустрэча з заслужаным дзеячам культуры СССР, мастаком Э. К. Акуловічам, мы таксама былі яшчэ толькі назіральнікамі. Праўда, больш зацікаўленымі не толькі экспанатамі музея, але і тым, як ён ствараўся, як рыхтавалася сучасная экспазіцыя, якія цяжкасці перашкаджалі Эдуарду Канстанцінавічу. На ўсіх нас чалавек гэты, які добра ведае гісторыю і культуру беларускага народа, аказаў вялікае ўражанне.

А пасля быў тыдзень упартай працы па знаёмству з экспазіцыяй музея. Па парадку, зала за залай, мы вывучалі экспанаты.

Той суботні дзень, калі мы ўпершыню ў жыцці самастойна праводзілі экскурсіі, пэўна, запомніцца надоўга. Спачатку губляліся патрэбныя словы, хацелася выказаць людзям усё тое, аб чым даведаўся сам за час знаходжання ў музеі. Таму так радавалі словы ўдзячнасці першых слухачоў. На другі і трэці раз нас ужо прымалі за сапраўдных экскурсаводаў.

Кожны раз, уваходзячы з групай экскурсантаў у чарговую залу, мы стараліся дапамагчы слухачам дакрануцца (і не толькі на хвіліну) да тых падзей, якія перажыла беларуская зямля і яе народ за гады вайны.

Дарэчы, сярод маіх сяброў былі прадстаўнікі розных рэспублік: Коля Марчанка і Оля Глуская — мае землякі, Энебай Какабаева з Туркменіі, Хуршэд Салімаў з Таджыкістана, Эдзік Цімчук з Малдавіі, Маша Міхайлава з Латвіі. За гады вучобы Беларусь стала для іх другой радзімай, а цяпер, па іх прызнанню, яны адчулі гэта яшчэ больш.

А. РУМАК,
студэнт гістфака.

У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ ЧЫТАЙЦЕ

Так ужо вядзецца, што сапраўдныя творцы аддаюць перавагу цішыні і адзіноце, адыходзячы ў куток ад шумлівых кампаній. Але часам і яны, творчыя людзі, адчуваюць вялікую патрэбу ў парадах, спрэчках, абмеркаваннях. Інакш, цяжка сказаць, ці існавала б наогул мастацтва.

Мы прадбачым, што на кожным факультэце знойдзецца не па аднаму-два — многа больш пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў, фотааматараў, крытыкаў.

Таму на адной з рэдакцыйных «лятучак» мы вырашылі адкрыць на старонках газеты завочны клуб творчай моладзі універсітэта «Майстроўня».

Першае слова ў наступным нумары — студэнтам філфака.

Запрашаем

Пакуль не позна (потым можа не быць) наведайце кніжны кіёск, які размешчаны ў галоўным корпусе БДУ, дзе зможаце набыць падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па розных спецыяльнасцях: Ильин В. А., Позняк Э. Г. «Аналитическая геометрия»; Кириллов А. А., Гвишиани А. Д. «Теоремы и задачи функционального анализа»; Размыслович Г. П. и др. «Геометрия и алгебра»; Борисоглебский Л. А. «Квантовая механика»; Галай И. П., Жучкевич В. А., Рылюк Г. Я. «Физическая география материков и океанов» і іншыя.

Т. ДОЎНАР.

ЗАРАЗ Алене Смірновай нават ёсць час папазіраваць фотакарэспандэнту: з работай справяцца сяброўкі. А ўспамінаюцца першыя дні работы на кансервавым заводзе, што ў г. Ізабільным. Банкі плывуць і плывуць перад вачыма, а рукі не спраўляюцца за імі ўслед. Гэта потым яны сталі такімі спрытнымі і ўмелымі. І ўсё роўна дзяўчына ні разу не пашкадавала аб тым, што паехала разам са сваімі аднакурснікамі працаваць у Стаўрапольле.

Нядоўга цягнуўся перыяд акліматызацыі і прыціркі характараў. Ды і няўпэўненасць у рабоце хутка прайшла. Як сведчанне — першае месца сярод зводнага атрада «Каўказ-1», якое заняў СА «Крыніца» (хімфак) па выніках першай дэкады.

(Працяг на 3-й стар.).

З ПАДШЫЎКІ «БУ»

Пабудуем сабе дом

У гэтыя дні, калі студэнты другіх, трэціх і чацвёртых курсаў дапамагаюць хлебаробам Дзяржынскага раёна ўбраць багаты ўраджай бульбы, іх малодшыя таварышы — першакурснікі — працуюць на будаўніцтве новага корпуса універсітэта.

(«БУ», № 25, 1960 г.).

Даніла Шыла дапамог

У № 12 нашай газеты пад назвай «Без вады... і з вадой» былі размешчаны дзве заметкі. Літаральна праз некалькі дзён камендант інтэрната № 2 А. Я. Гарачава паведаміла рэдакцыі, што «цяпер вада падаецца на ўсе паверхі, ва ўмывальніках ужо няма чэргаў». Добра, тут усё ў парадку, падумаў Даніла Шыла.

А вось у інтэрнаце па вуліцы Свярдлова пайшлі па шляху найменшага супраціўлення: там проста адчынілі парадны ўваход. Цяпер, зразумела, ногі не замочыш. Але лужына і грязь ля другога ўваходу засталіся.

(«БУ», № 14, 1963 г.).

Цалінаграда

Год 1964. 320 студэнтаў фізічнага, гістарычнага, матэматычнага, юрыдычнага і філалагічнага факультэтаў у Чапаеўскім раёне Уральскай вобласці пабудавалі больш 50-ці аб'ектаў, вытворчая сродкаў на суму 658 тысяч 240 рублёў.

Год 1965. У гэтым годзе студэнты універсітэта у трэці раз паедуць на Цаліну. Як і раней, будзем будаваць грамадскія памяшканні, жылыя дамы, пракладваць водныя магістралі. Сёлета фарміруецца ва універсітэце восем будаўнічых атрадаў, якія налічваюць у сваіх радах 440 юнакоў і дзяўчат.

У саўгасы Казахстана паляцелі першыя «ластаўкі» — разведчыкі 40-тысячнага атрада студэнтаў краіны. Сярод іх і чатыры нашы пасланцы: Іван Цвірко, студэнт фізфака, былы камандзір атрада-сцяганосца «Аэліта», Уладзімір Пташнікаў, студэнт юрфака, член атрада «Феміда», студэнты-матэматыкі Міхаіл Трацьяк і Анатоль Бяссонаў.

В. ЧУМАКОЎ.

(«БУ», № 6, 1965 г.).

Не шукайце вінаватых...

І пачалося.

Адзін за другім выходзілі камсамольцы на трыбуну і... «Так, камітэт камсамола працаваў дрэнна, не было сувязі з камсамольцамі факультэта, не было выхаваўчай працы, не было... не было...» А што ж было?

Ва ўсіх недахопах у рабоце камітэта камсамола абвінавачвалі сакратара А. Карабана. Ці гэта правільна? Хіба ён адзін здольны весці камсамольскую работу на ўсім факультэце? Зразумела, не. Мабыць, у многіх недахопах вінаваты самі студэнты.

М. СКВАРЦОЎ.

(«БУ», № 26, 1965 г.).

Тройка? А чым яна лепш?

«Пісьмо тваё, Віталій, мне спадабалася. Хочацца пазнаёміцца з табой бліжэй — аднадумцы мы. Я таксама кругленькі, як кажуць, троечнік пяты гадок... Дыплом хутка выдадуць такі, як і астатнім — там не напісана — «пацёрачнік» я ці «троечнік». Арыгінальна нехта прыдумаў.

Згодзен з табой, Віталій: з тройкамі не прападзеш».

Іван.

Сярод маіх знаёмых студэнтаў сустракаюцца тыя, якія прыходзяць у кабінет ці бібліятэку чытаць толькі тое, што патрэбна па праграме. Каб толькі здаць на экзаменах. Прызнаюць адзнаку толькі «выдатна». А здарыцца іншы раз, што атрымаюць «чацвёрку» ці нават «тройку» — перажываюць гэта цяжэй любой хваробы, ідуць здаваць другі раз, каб толькі дабіцца свайго.

«Вучоны сухар ты»,— гавораць пра такіх, і ці гэта не праўда?

Можа, давайце не хваліцца той ці іншай адзнакай, а рыхтаваць з сябе вартасных спецыялістаў.

Ю. АГАРАДНІЧЭНКА,
студэнт.
(«БУ», № 32, 1965 г.).

Другую прафесію? Калі ласка!

Ідзе прыём заяў на факультэт грамадскіх прафесій, дзе з першага кастрычніка пачнуцца заняткі. Гэта самы малады факультэт нашага універсітэта — яму пайшоў толькі чацвёрты год. У мінулым годзе заняткі на яго сямі аддзяленнях наведвала больш як 400 чалавек. Сёлета на факультэце адкрываюцца наступныя аддзяленні: рэжысёрскае, хормайстарскае, харэаграфічнае, кінафотааматараў, лектарскага майстэрства, піянерважатых, інструктараў і суддзяў фізкультуры.

Дык, таварышы студэнты, другую прафесію? Калі ласка!

А. КАЖУШКОЎ,
кандыдат гістарычных навук,
дэкан ФГП.
(«БУ», № 15, 1965 г.).

Да ВНУ і потым

ПРАЙШОЎ яшчэ адзін вучэбны год ва ўмовах перабудовы вышэйшай школы ў нашай краіне, якая праводзілася ў адпаведнасці з Пастановамі ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб асноўных напрамках перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне».

Сёлета атрымалі дыплом аб вышэйшай адукацыі 1414 выпускнікоў універсітэта дзённай формы навучання, 1020 вячэрняй і завочнай, 90 замежных навучэнцаў паехалі працаваць у свае краіны. Аспірантуру закончыла 117 чалавек. 113 супрацоўнікаў абаранілі кандыдацкія дысертацыі, 9 — доктарскія.

Ажыццяўляючы перабудову вучэбнага працэсу, рэктарат зыходзіў з таго, што універсітэцкая адукацыя павінна адрознівацца высокай фундаментальнай і прафесійнай падрыхтоўкай у адпаведных галінах ведаў з фарміраваннем у спецыяліста высокіх ідэйных, маральна-этычных і культурных якасцей.

У мінулым годзе па індывідуальных планах у нас займаліся каля 100 чалавек. Мяркую, што ў гэтым годзе даная лічба павінна істотна ўзрасці.

Яшчэ адной тэндэнцыяй, якая ўсё больш актыўна праяўляецца ў вышэйшай школе, з'яўляецца аб'яднанне намаганняў ВНУ рознага ўзроўню і рознага профілю ў аказанні адзін аднаму дапамогі ў падрыхтоўцы кадраў. Гэта ўзаемная дапамога праяўляецца ў сумесным стварэнні і выкарыстанні матэрыяльнай базы вучэбнага працэсу, у абмене выкладчыкамі, а таксама студэнтамі і студэнцкімі групамі. Карацей, адукацыя становіцца ўсё менш лакалізаванай у адной вышэйшай навучальнай установе. Яна можа пачынацца ў адной ВНУ і заканчвацца ў другой ці асобныя стадыі навучання могуць праходзіць у розных ВНУ.

На жаль, мы, маючы кантакты з замежнымі універсітэтамі, дагавор аб супрацоўніцтве з Вільнюскім універсітэтам, практычна ізаліраваны ад астатніх мінскіх ВНУ.

Што зроблена ў гэтым ключы?

Работа ішла па наступных напрамках:

— удасканаленне вучэбных планаў;

— скарачэнне абавязковых аўдыторных заняткаў і развіццё ў студэнтаў самастойнасці;

— умацаванне сувязі з практыкай;

— далучэнне студэнтаў да навуковых даследаванняў;

— расшырэнне дэмакратычных прынцыпаў кіравання ВНУ.

Важнейшай канцэпцыяй сучаснай сістэмы адукацыі з'яўляецца яе перманентнасць, бесперапыннасць, калі адукацыя ахоплівае ўсе стадыі жыцця чалавека, ад дзіцячага да пенсіённага ўзросту.

Таму зараз асаблівую актуальнасць набывае праблема ўмацавання нашых сувязей з сярэдняй школай.

Універсітэт ніколі не быў у баку ад школьных праблем і не мог быць, таму што мы рыхтуем для школы настаўнікаў. Толькі ў гэтым годзе правялі свой першы ўрок 440 нашых выпускнікоў. Вучонымі універсітэта напісаны шэраг падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для сярэдняй школы. Асабліва актыўна працуюць у гэтым напрамку выкладчыкі філалагічнага факультэта. Акрамя таго, універсітэт выпускае дапаможнікі для абітурыентаў. На ўсіх факультэтах працуюць і добра зарэкамендавалі сябе «школы юных». Некаторыя факультэты, напрыклад, механіка-матэматычны і біялагічны, маюць па дзве такія школы. Мы абсталявалі два класы ЭВМ у падшэфных школах Маскоўскага раёна г. Мінска.

Пытанне зараз у тым, каб падняць сувязь са школай на якасна новую, больш высокую ступень. Кожны факультэт, на наш погляд, павінен мець сваю базавую школу, у якой можна было б не толькі разгарнуць шэфскую работу, але і рыхтаваць «сваіх» абітурыентаў. Такі вопыт ёсць на механіка-матэматычным факультэце, які цесна супрацоўнічае з СШ № 170. Дарэчы, трэцяя частка выпускнікоў «матэматычнага» класа гэтай школы паступілі ва універсітэт. У гэтым годзе на фізічным факультэце створана новая кафедра — методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі. Мы лічым, што яна акажа істотную дапамогу і сярэдняй школе.

На жаль, па-ранейшаму не праяўляе патрэбнай актыўнасці ў наладжванні сувязей са школай кафедра педагогікі, хаця, здавалася б ,ёй і «карты ў рукі». Толькі адзін супрацоўнік кафедры паралельна выкладае ў школе, ды і тое з вясны гэтага года. Кафедра не мае падшэфнай школы ці класа, няма ў яе і ніводнага дагавору са школамі. Становішча патрэбна выпраўляць.

Нам час было б падумаць і аб стварэнні філіялаў кафедраў у школе.

Не сакрэт, што многія таленавітыя рабяты выязджаюць з рэспублікі паступаць у ВНУ Масквы і Ленінграда. У цэлым гэта нядрэнна, але ж і нам патрэбны таленты. Прывяду прыклад. З дзевяці мінулагодніх пераможцаў Рэспубліканскай алімпіяды школьнікаў па трох прадметах — матэматыцы, фізіцы, хіміі — толькі тры паступілі ў БДУ. Прычым, усе яны занялі трэція месцы па сваіх прадметах. А лепшыя паехалі. Напэўна, добра было б звярнуцца ў Міністэрства народнай адукацыі з прапановай залічваць пераможцаў Рэспубліканскай алімпіяды ва універсітэт без экзаменаў ці хаця б залічваць ім выдатную адзнаку па прадмету.

Сістэма перманентнай адукацыі патрабуе таксама павышэння ролі ВНУ у паслявузаўскай адукацыі (павышэнне кваліфікацыі, перападрыхтоўка). У гэтым плане ў нас развіваецца сістэма факультэтаў і курсаў павышэння кваліфікацыі спецыялістаў. Гэта вельмі важная сацыяльная функцыя універсітэта. Універсітэт мае добры Інстытут павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадазнаўчых навук, у якім праходзяць перападрыхтоўку выкладчыкі з усёй краіны. Добра працуюць і факультэты павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Патрэбна адзначыць факультэт прыкладной матэматыкі, які даў магчымасць павысіць кваліфікацыю па сучасных галінах многім спецыялістам, стварыўшы два факультэты: факультэт павышэння кваліфікацыі па прыкладной матэматыцы і спецфакультэт перападрыхтоўкі кадраў па прыкладной матэматыцы. Плённа працуе пры біяфаку спецфакультэт па экалогіі і павышэнню эфектыўнасці выкарыстання прыродных рэсурсаў.

З улікам развіцця сістэмы перманентнай адукацыі павінны відазмяняцца і ўдасканальвацца праграмы і вучэбныя планы.

Падняць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў можна толькі рашуча павярнуўшы ад масавага навучання да ўзмацнення індывідуальнага падыходу. Студэнт павінен сам мець магчымасць арганізаваць сваю работу, вызначыць яе інтэнсіўнасць, канкрэтныя формы.



Пастаянна развіваецца і ўмацоўваецца наша супрацоўніцтва з АН БССР. У гэтым годзе была прынята сумесная пастанова Прэзідыума АН БССР і калегіі нашага міністэрства па развіццю супрацоўніцтва. Зараз рыхтуюцца дагаворы паміж нашымі факультэтамі і адпаведнымі інстытутамі Акадэміі. Важна, што ў іх падрыхтоўку ўключыліся не толькі факультэты прыродазнаўча-навуковага профілю, але і гуманітарнага: філфак і гістфак.

Асноўны рычаг перабудовы вышэйшай адукацыі — цесная інтэграцыя з вытворчасцю і навукай, пераход да новых прынцыпаў іх узаемадзеяння.

Плённасць супрацоўніцтва універсітэта з вытворчасцю мы бачым на прыкладзе вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання «БДУ— ВА «Інтэграл», створанага яшчэ ў 1976 годзе. Гэта дазваляе прадпрыемствам больш поўна выкарыстоўваць навуковы патэнцыял вышэйшай школы, а ВНУ — паскараць укараненне ў практыку сваіх распрацовак, падняць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў, наблізіць яе да патрабаванняў вытворчасці.

Зараз створаны і дзейнічаюць ВНВА не толькі з «Інтэгралам», але і з аб'яднаннямі «Гранат», «Планар», «Вылічальная тэхніка». На змену асобным, эпізадычным кантактам у сістэме універсітэт-вытворчасць прыходзяць доўгатэрміновыя, трывалыя сувязі. Арганізаваны і развіваюць сваю работу 17 філіялаў кафедраў у вытворчых аб'яднаннях, акадэмічных інстытутах, рэдакцыях газет і г.д.

Для чытання лекцый па асобных курсах ва універсітэт запрашаюцца вядомыя вучоныя з АН БССР і спецыялісты прамысловых прадпрыемстваў, арганізацый.

Сур'ёзнай увагі заслугоўвае праект стварэння вучэбна-навукова-даследчага комплексу БДУ — АН БССР. Гэта дазволіць вырашыць многія праблемы, у тым ліку і павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, аб'яднання навуковых сіл і матэрыяльных рэсурсаў. Першыя крокі ў гэтым напрамку зроблены.

Універсітэт па-ранейшаму захоўвае і развівае свой навуковы патэнцыял, які ўключае ў сябе кафедральную навуку, факультэцкія навукова-даследчыя лабараторыі і доследныя станцыі, тры самастойныя навукова-даследчыя інстытуты.

Вялікую ўвагу ўдзяляе рэктарат развіццю студэнцкай навукі, далучэнню студэнтаў да НДР і навукова-тэхнічнай творчасці. Адна з традыцыйных і эфектыўных форм — работа студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый (СНДЛ). Зараз у нас працуюць 18 кафедральных СНДЛ на шасці факультэтах прыродазнаўча-навуковага профілю, у іх удзельнічае каля 340 студэнтаў. Дарэчы, апошнімі атрымана 14 аўтарскіх пасведчанняў, што складае амаль 11 працэнтаў ад агульнай колькасці аўтарскіх пасведчанняў, атрыманых супрацоўнікамі універсітэта.

У мінулым навучальным годзе была заменена працэдура перавыбрання на новы тэрмін работы выкладчыкаў і загадчыкаў кафедраў на конкурснае выбранне. З 1400 чалавек прафесарска-выкладчыцкага састава на саветах факультэтаў і універсітэта конкурснае выбранне прайшлі каля 350, у тым ліку 24 загадчыкі кафедраў, 197 прафесараў і дацэнтаў. Гэтым яны пацвердзілі права займаць адпаведныя пасады. Аднак былі і такія, хто не вытрымаў канкурэнцыі з боку неуніверсітэцкіх, больш кваліфікаваных кандыдатур. Ім давялося пакінуць свае пасады.

Сёння нельга не закрануць і такую важную праблему, як праблема беларускай мовы. Апошнія дзесяцігоддзі пакінулі нам цэлы тузін супярэчнасцей, звязаных са сферай распаўсюджання беларускай мовы. Шмат было ўпушчэнняў і ў вышэйшай школе. Беларуская мова амаль цалкам знікла на многіх факультэтах нашага універсітэта. Зараз мы адкрыта гаворым аб тым, што такое становішча патрэбна выпраўляць. Але рабіць гэта патрэбна без прыжкоў і без прымусу. У Беларусі работа па адраджэнню беларускай мовы пачата партыйнымі органамі, сродкамі масавай інфармацыі, вядомымі дзеячамі літаратуры і мастацтва. Універсітэт не можа заставацца ўбаку. Што ж у нас зроблена? На многіх факультэтах чытаецца курс «Гісторыя БССР» на беларускай мове.

На некаторых факультэтах прыступілі да выкладання беларускай літаратуры і мовы. На філфаку і журфаку гэта прадугледжана новымі вучэбнымі планамі. На педагагічных патоках хімічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў беларуская літаратура вывучаецца ў аб'ёме па 30 гадзіны. А вось на юрфаку пакуль беларускую мову не вывучаюць.

Вялікую дапамогу ў гэтай справе нам мог бы аказваць Саюз пісьменнікаў, іншыя творчыя арганізацыі, з якімі нам патрэбна больш цесна супрацоўнічаць.

Ужо на працягу года студэнты з'яўляюцца членамі розных саветаў. Што наконт гэтага можна сказаць? Мяркую, што ў гэтым годзе мы пачуем больш сур'ёзныя і канкрэтныя прапановы. Магчыма, патрэбна даручыць студэнтам падрыхтоўку некалькіх пытанняў на пасяджэнні вучонага савета...

Марудна ідзе і ўкараненне студэнцкага самакіравання ў інтэрнатах універсітэта, дзе ёсць нямала праблем. Гады два не могуць вырашыць гэта пытанне жыхары «адзінкі» (гістфак), хаця станоўчы вопыт такога пераходу ёсць. У інтэрнатах № 6 (ФПМ) і № 4 (юрфак), пераведзеных на самакіраванне, стала больш чыста і акуратна, студэнты беражліва адносяцца да маёмасці, створаны клубы па інтарэсах, відэасалоны, рэгулярна праводзяцца вечары адпачынку.

Л. І. КІСЯЛЕЎСКІ, рэктар, акадэмік АН БССР.

Далей у сваім дакладзе Л. І. Кісялеўскі спыніўся на праблемах паляпшэння эстэтычнага выхавання студэнцтва, адзначыў, што у гэтай рабоце шмат фармалізму і заарганізаванасці. Неабходна шукаць і новыя формы выхаваўчай работы выкладчыкаў, увесці ў практыку рэгулярныя сустрэчы іх са студэнтамі, правядзенне сумесных дыспутаў, вечароў адпачынку.

Не засталіся па-за ўвагай дакладчыка і праблемы будаўніцтва маладзёжнага жыллёвага комплексу, пытанне аб развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы БДУ.

У заключэнне Л. І. Кісялеўскі адзначыў, што калектыў нашага універсітэта перажывае зараз адказны перыяд. Перабудова закранула ўсе асноўныя бакі дзейнасці ВНУ, прымусіла нас крытычна разгледзець вузаўскія традыцыі, вызначыла новыя падыходы ў рашэнні нашай асноўнай задачы — павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

Усё меншую ролю сталі зараз адыгрываць загады, пастановы, інструкцыі, пакаранні.

На першы план ставяцца такія фактары, як веды, шчырасць, свядомасць, ініцыятыва, настойлівасць, смеласць, перакананне, працавітасць.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).



— Але, упэўнены, не гэта галоўнае,— выказвае ўласную думку камандзір атрада Фёдар Завадскі.— Работа, безумоўна, добра. Толькі студэнту ў першую чаргу патрэбен адпачынак. Пасля лекцый, семінараў, практычных, калоквіумаў, сесіі нарэшце. І мы адпачывалі. Я б сказаў цудоўна. Выступленне агітбрыгады, конкурсы, спаборніцтвы. Усё было. Але часта адпачынак — гэта ціхая, задушэўная размова з чалавекам або проста адасабленне. Таму мы не стараліся прымушаць чалавека, напрыклад, спяваць ці танцаваць, калі ў яго душа не ляжыць да гэтага.

Згодна, усё павінна быць добраахвотным, тады не будзе і жадаючых «выкруціцца» з будатрада, а наадварот, у іх будуць запісвацца з ахвотай. Як, напрыклад, Алена Белічэнка і Наталля Бандаровіч, якіх вы бачыце на здымках.

З. АЛЯКСАНДРАВА.
Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

НА ВАШУ КНІЖНУЮ ПАЛІЦУ

Зручна, хутка, гарантавана

Вы калі-небудзь карысталіся папярэднім заказам кніг? Не? Абавязкова паспрабуйце. Па-першае,— гэта гарантыя таго, што неабходную кнігу вы абавязкова атрымаеце, па-другое, сэканоміце час, які б затрацілі на пошукі цікавячага выдання ў кнігарнях. Але паспяшайцеся, бо прыём заказаў на 1989 год хутка закончыцца.

ВЫКАРЫСТАЦЬ такі від паслуг могуць і студэнты-філолагі — будучыя настаўнікі рускай мовы і літаратуры. Магазін «Метадычная кніга» прапануе вам наступныя выданні, якія акажуць неацэнную дапамогу ў будучай працоўнай дзейнасці.

Богданова Г. Опрос на уроках русского языка. М., Просвещение, 1989. Чым каштоўная кніга? У ёй дадзены асноўныя віды і формы апытання па ўсіх раздзелах школьнага курса рускай мовы і па ўсіх паралелях (5—9 кл). Усе метадычныя палажэнні падмацаваны прыкладамі ўрокаў ці іх фрагментамі. Вялікае месца ў дапаможніку адведзена тым відам праверкі ведаў навучэнцаў, якія даюць настаўніку неадкладныя рэзультаты (перфакарты, лісткі кантролю і г.д.) і не патрабуюць вялікай затраты часу на іх праверку. Мэта выдання — дапамагчы маладому настаўніку паспяхова вырашаць складаную метадычную праблему своечасовага і сістэматычнага кантролю за засваеннем навучэнцамі праграмнага матэрыялу.

Калі вы хочаце больш падрабязна пазнаёміцца з жыццём і творчасцю рускіх пісьменнікаў і літаратурных крытыкаў XVIII — пачатку XX стагоддзяў (да 1917 г.), абавязкова пастарайцеся набыць кнігу *Русские писатели. Библиографический словарь, в 2-х томах. М., Просвещение, 1989.* Выданне характэрна тым, што для спецыяльнага аналізу вылучаны найбольш важныя (асабліва тыя, што ўключаны ў школьную праграму) творы і крытычныя артыкулы. Дарэчы, усе яны дапоўнены бібліяграфіяй і партрэтамі пісьменнікаў.

Сазонова И. Русский глагол и его причастные формы. Толково-грамматический словарь. М., Русский язык, 1989. Тут вы знойдзеце каля 2,5 тысяч рускіх дзеясловаў і каля 7 тыс. іх дзеепрыметных форм. Упершыню на вялікім матэрыяле апісаны сэнсавыя адносіны дзеясловаў і іх дзеепрыметнікаў, дзеяслоўнае кіраванне і яго ўзаемасувязь з дзеепрыметнікам.

Лінгвістычнае апісанне (у вучэбных мэтах) складаных з'яў рускай марфалогіі ўяўляе сабой *«Словарь грамматических трудностей русского языка» (М., Русский язык, 1989) Т. Яфрэмавай і У. Кастамарава.*

Як жа аформіць папярэдні заказ на гэтыя і іншыя выданні? Для гэтага на паштоўцы на адным баку ўказваецца адрас заказчыка, а на другім — выдавецтва, назва кнігі, дата афармлення. Прычым, вам не абавязкова везці паштоўку ў магазін: вы можаце адправіць яе па пошце на адрас: 220074. г. Мінск, вул. Берута, 22, корп. 2. Магазін № 19. «Метадычная кніга» (тэлефон для даведак 51-64-17). Аб паступленні заказанай кнігі вам паведамяць пакінутай паштоўкай. Але не адкладвайце атрымаць выданне, бо захоўваецца яно ў магазіне ўсяго дзесяць дзён.

Т. РАДЗІКА,
таваразнаўца.

Перад абедам зноў, як па раскладу, пачаў накрапваць дождж, гатовы, быццам, капрызнае дзіця, расплакацца безуцешна і надоўга.

— Гэты год, як ніколі, цяжкі для нас,— заўважыў Генадзь Юрчанка, сеўшы ў машыну.— Не толькі таму, што надвор'е кепскае (да яго ўжо прывыклі), тут іншае. Шмат праблем з размяшчэннем студэнтаў, з забеспячэннем іх работай, з якасцю ежы. І ўжо, звяртаючыся да вадзіцеля, дадаў:

— У калгас «Рассвет»... У ім працуюць філосафы,— пачаў тлумачыць ён,— адзін з лепшых атрадаў. І ўмовы ў іх, у параўнанні з астатнімі, нядрэнныя. Там старшынёю калгаса зараз Аляксандр Анатольевіч Рылькоў (у мінулым першы сакратар райкома камсамола). Так што студэнцкія праблемы яму добра знаёмыя, стараецца дапамагчы. У гэтым годзе новы інтэрнат для іх пабудаваў.

І пакуль наш «уазік» быў у дарозе, намеснік камандзіра Круглянскага занальнага штаба сельгасатрадаў Г. М. Юрчанка працягваў размову, пачатую ў райкоме камсамола разам з камандзірам занальнага штаба А. А. Стуканавым.

Рамантыкі з льнянога поля



Іх кожны год сустракаюць урачыста. Як добра знаёмых сяброў: з аркестрам і віншаваннямі на прывакзальнай плошчы. А пасля працы ў калгасах і саўгасах Круглянскага раёна сярод 700 студэнтаў, што прыехалі сюды з БДУ імя У. І. Леніна, будуць вызначаны лепшыя брыгады, і на вечары працоўнай славы ва універсітэце ім уручаць граматы, каштоўныя падарункі... Чаму толькі студэнты часцей успамінаюць не гэтыя святочныя віншаванні, а, здаецца, больш будзённае, але не менш неабходнае — клопат аб іх ў гаспадарках, куды яны прыязджаюць працаваць? Студэнты даўно заўважылі, што ў некаторых гаспадарках традыцыйна абыякава адносяцца да тых, хто ім дапамагае. Абяцанні так і застаюцца абяцаннямі. Такое «супрацоўніцтва» студэнты трапна называюць добраахвотна-прымусовым.

— Нам кажуць: вы прыехалі дапамагаць калгасу. Смешна слухаць. А калі яны нават уладкаваць не могуць, чаму мы павінны пакутаваць тут? А паспрабуй паехаць свавольна, адразу пужаюць адлічэннем з універсітэта. На месцах жа разважаюць так: прыедуць студэнты, там разбяромся, дзе сяліць, чым карміць.

Да чаго гэта вядзе, добра сведчаць тыя выпадкі, аб якіх расказаў Г. М. Юрчанка:

— Вось саўгас «Авангард». Пяты год мы працуем тут. І штогод — праблемы. Гаспадарам не хапае заўсёды дватры дні, каб падрыхтаваць жыллё, харчаванне. Складваецца ўражанне, што дырэктару саўгаса Я. В. Бярозку ўсё роўна. Адсюль — канфлікты. Студэнты дрэнна працуюць, адмаўляюцца выконваць работу, не ўказаную ў дагаворах, хварэюць. Бывае, няма элементарных умоў: не апальваюцца памяшканні, адсутнічаюць умывальнікі, няма туалетаў. Потым ўсё робіцца. Але толькі праз два тыдні пасля прыезду студэнтаў. У такіх гаспадарках усур'ёз студэнтамі ніхто не займаецца. Яны не ведаюць нормаў выпрацоўкі, расцэнак. У калгасе «Кастрычнік» лічаць, што добра і так, кажуць: «Мы ў свой час жылі горш». Тут адсутнічаюць сушылкі для адзення, абутку. На мясцовым ільнозаводзе хлопцы жывуць у неацяпляльным памяшканні, якое працякае. Як вынік усяго гэтага — у бальніцу і паліклініку звярнулася на 20 вярсня больш 70 чалавек, а да канца працоўнага семестра, магчыма, будзе значна больш. Атрымліваецца, што кожны дзесяты, прыехаўшы дапамагаць ў раён, хварэе ці хварэў.

За гэтай размовай мы і пад'ехалі да інтэрната калгаса «Рассвет», дзе размясцілася каля 50 студэнтаў гістарычнага факультэта аддзялення філасофіі БДУ імя У. І. Леніна. За суткі, што я тут пражыў, здарыліся два выпадкі. Першы з іх адбыўся адразу пасля знаёмства. Аспіранта кафедры гісторыі і філасофіі У. А. Унуковіча прыслалі на змену свайму таварышу, які «адбыў» прызначаныя два тыдні. І вось цяпер перад намі стаяць дзве дзяўчынкі-першакурсніцы і гавораць, што аб'явілі галадоўку і пакуль Унуковіч не папросіць прабачэння за свой учынак, якім ён зняважыў іх, яны есці не будуць. Аказваецца, пасля работы дзяўчаты адпачывалі ў сваім пакоі і гадалі на картах. У гэты момант і зайшоў да іх кіраўнік. Ён без лішніх слоў забраў карты, навачах у дзяўчат пачаў іх рваць, здзекліва ўсміхаючыся. Тыя ў плач, а потым — такое рашэнне.

У наступны дзень увесь атрад у абед застаўся без ежы. Аказалася, дзяжурныя не пажадалі памыць посуд, калі змяняліся. А новыя, абурыўшыся, не сталі за іх перамываць, пакінуўшы, як было. Хто правы, а хто вінаваты? Пачалася спрэчка. Урэшце сышліся на тым, што як бы там ні было, але гэта не спосаб выказваць свае адносіны, пакідаючы без ежы памочнік кіраўніку атрада У. М. Рэйзіну сапраўды не патрэбен. Атрад павінен яго мець пры колькасці 60 і больш чалавек. Наконт абавязкаў, якія павінен быў выконваць, У. А. Унуковіч нічога не ведаў. Так і паехаў працаваць, не разумеючы для чаго.

Ну, а як наогул працуюць студэнты? Брыгадзір калгаса «Рассвет» І. І. Ісачанка лічыць, што няроўна. Некаторыя добра, як, напрыклад, чацвёртакурснікі аддзялення філасофіі, а іншыя толькі «адбываюць». Але калі не перашкаджае надвор'е, то са сваёй нормай: звязаць дзвесце снапоў, спраўляюцца, а некаторыя робяць у некалькі разоў больш.

Я невыпадкова прыводзіў гэтыя прыклады, паспрабуем падвесці невялікі вынік. Калі прааналізаваць, то атрымліваецца, што значная колькасць гаспадарак не кваліфіцыруюцца па-сапраўднаму аб лесе працуючых. Адсюль — шматлікія канфлікты і здарэнні, якіх магло і не быць. Але гэта яшчэ не самае горшае. Успомніце, колькі радасці і энтузіязму ў кожнага першакурсніка, які едзе на сваю першую «бульбу». І як стрымана, іранічна глядзяць на яго падрыхтоўванні старшакурснікі. «Чаму ты радуешся? — не вытрымае хто-небудзь з іх.— Ты яшчэ не ведаеш, як там цябе прымуць».

— Ну і што. Гэта не галоўнае, затое колькі ўражанняў, знаёмстваў, адным словам, рамантыка.

— Нічога,— усміхаюцца скептыкі,— паглядзім, што ты скажаш пасля.

І амаль заўсёды яны маюць рацыю. Але праз год на змену прыходзяць новыя рамантыкі на нашы бульбяныя і ільняныя палі. Толькі, каб не пустыя абяцанні, іх было б значна больш. І як вынік — лепшай была б дапамога.

А. МАКСІМАЎ.
Фота аўтара.





Рэпартаж з льнянога поля вёў А. Максімаў, наш кар.

А СТРОЙГІТАРЫ НЕ ЦЕРПЯЦЬ ФАЛЬШУ?

УРАЖАННІ ЎДЗЕЛЬНІКА

— А нам адразу пажадана было б трапіць ва «ўласны» будатрад. Каб усёй групай. Праходзілі інстанцыю за інстанцыяй. Пасля першага курса не вельмі носам пакруціш. Ды мы й не імкнуліся ў выязны атрад. Усё роўна неяк было куды ехаць. Толькі б усім разам.

Самі дамагаліся? Вось нам і прапанавалі: Клецкі раён, вёска Янавічы, цагельны завод. Восем тон цэглы праз рукі ў дзень — гэта вам жартачкі? Трое «цяжкіх» у дзявочым атрадзе — усё як мае быць?

«Рамантыкі» прагматыкамі ўсё роўна не сталі. Ні потым, у Старых Дубасарах, ні ў гэтым годзе ў Малдавіі. Едучы ў студэнцкі атрад, не разлічваем на царскія палацы. Не для таго, каб адшукваць недахопы, нас сюды запрасілі. І не для таго, каб прывезлі стосы папер, накшталт лекцый («Дзе, каму іх чытаць у лагеры?»), нумароў агітбрыгады, спехам сабраных у адзін сцэнарый («Гэта ж здзек над мастацтвам і творчасцю»), ленінскага задання («Ёсць нават нешта блюзнерскае ў тым, што ў дзіцячы дом прыходзяць не па жаданню, а па заданню. Ісці да дзяцей і пазіраць на гадзіннік: ці хутка канец!»).

Алена БЯЛЯЕВА,
камандзір атрада «Рамантыкі»,
ФПМ.

НАТАТКІ З ПРЫХІЛЬНАСЦЮ

ГІСТОРЫЯ «МАРЫ»

НАЗІРАННІ СТАРОННЯЙ АСОБЫ

Быццам знарок з самай раніцы сонца ні на хвіліну не хаваецца за хмарамі. Пяшчотная цеплыня перарастае ў неміласэрную спякоту, таму гледачам — жыхарам Слабадзеі, не так ужо і лёгка сачыць за ходам студэнцкага фестываля «Вара».

Святочныя калоны беларускіх студэнтаў; тут жа, на сялянскай вуліцы, выстаўка кветак: «жывыя» старонкі, прысвечаныя 70-годдзю Ленінскага камсамола,— вось што такое «Вара».

Дзве з паловай тысячы беларускіх студэнтаў, якія прыехалі ў Малдавію аказваць дапамогу ва ўборцы пладова-агароднінай прадукцыі — гэта тыя, без чыіх будняў не было б «Вары».

26 замежных студэнтаў з дзевяці краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, якія працавалі ў саставе зводнага атрада «Прыеценія» калгаса імя Леніна — тыя, хто быў сярод арганізатараў і гледачоў «Вары».

«Гарманічнае ўзаемадзеянне з прыродай — вось шлях, па якім чалавецтва павінна прыйсці да свайго будучага. Зірніце навокал! Для кожнага з вас знойдзецца справа па навядзенню парадку на Зямлі!» — заклік удзельнікаў экалагічнай экспедыцыі «Днестр» таксама прагучаў у час «Вары».

«Вара» для Малдавіі — свята ўраджаю, спартыўныя спаборніцтвы, конкурсы песні, наглядная агітацыі, агітбрыгад, паварот.

З матэрыялу газеты
«Сельская новь» г. Слабадзея.

У такі вечар «Мара» проста не змагла б стрымаць усмешкі. Самадзейны спектакль па «самапіснай казцы для байцоў сярэдняга і малодшага ўзросту», падрыхтаваны сіламі «старых», прыдзірлівымі гледачамі быў адзначаны такім выбухам апладысментаў, што нават прадстаўнікі суседняга «Дойліда» зацікавіліся: пачалі зазіраць у акенцы сталоўкі. За святочнай «салодкай» вячэрай (дзякуй намесніку камандзіра зводнага атрада Ніне Андрэеўне Кісялёвай, а таксама жаданню і майстэрству дзяўчынак, якія ёй дапамагалі) і адышоўшы пакуль яшчэ ў недалёкае мінулае дзень прысвячэння ў байцы «навічкоў»: «А як усё ж з дапамогай фотаапарата адраманташ скрынку?», і водбліскі агню першага знаёмства: «Вы ж яшчэ не чулі ўсе нашы песні!», і заканамернае здзіўленне: «Няўжо было калісьці, каб працавалі «мараўкі» з шасці гадзін раніцы да паловы адзінаццатай увечары?» здаюцца імгненнямі ўсё таго ж свята.

Так, у такі вечар «Мара» проста не змагла б стрымаць усмешкі — яна святкавала пятнаццатае лета свайго жыцця. «Калі ў вас няма сяброў, вы абавязкова знойдзеце іх у «Мары», калі вы жадаеце праверыць сваю працоўную загартоўку, вынослівасць, стаць чорнымі ад загару,— гэта вы знойдзеце ў «Мары», — безагаворачна лічыла не адно пакаленне філфакаўцаў.

Калі ж уважліва прыгледзецца да ўсмешак «маравак», былі яны не падобнымі адна на адну. Захоплена – бесклапотная ў вясёлай Светы Некрашэвіч:

— Конкурс, ведаеце, які звычайна ў нас быў? Трычатыры чалавекі на месца. Я аб «Мары» пачула яшчэ ад дзяўчат, што мае дакументы пры паступленні ва універсітэт прымалі. Таму ідэя — усёй групай у «Мару»! — узнікла яшчэ да таго, як стала студэнткай. Не так ужо і проста было на справе яе ажыццявіць. Не ведаю, чым былі б запоўнены студэнцкія гады без атрада, дзяўчат, Малдавіі. Тут на ўсіх іншымі вачыма глядзіш — ёсць з чым параўноўваць.

Пакрыўджана-разгублена ўсміхаецца Вольга Аврэйцэвіч і працягвае расказ аб атрадзе споведдзю камандзіра:

— Набор даўно быў скончаны, а атрад не ўкамплектаваны. Што здарылася? Дзе той бясконцы паток жадаючых працаваць у «Мары»? Цяжка. Мне, як камандзіру, часам хацелася ў час падрыхтоўчага перыяду пакараць недысцыплінаваных байцоў, нават адлічыць каго-небудзь, каб менш было выпадковых людзей. Але тут жа баялася: зусім адна застануся. Мучыла настальгія па часах мінулых, калі прэтэндэнты на месца гатовы былі ўскласці на сябе любыя абавязкі, толькі б убачыць сваё прозвішча ў спісе «асноўнага» саставу.

«Некамплект» усё ж атрымаўся. Прыйшлося запрашаць байцоў з боку. Што зробіш — драбнеюць людзі. Выбралі падарожжа на поўдзень ці ў Балгарыю...

Вера Дзянісава, камісар зводнага атрада і таксама «мараўка»:

— Бачыш, гэта Пеця Навіцкі, баец «Мары-79» і камандзір «Мары-81», гэта — прысвячэнне ў байцы-78,— мы перакладваем фотаздымкі.

Успаміны, па ўсім відаць, прыемныя, а сённяшняя «Мара» не тое, каб зусім Веру не задавальняла: традыцыі ўсё ж захоўваюцца, але, адчуваю, непакоіцца Вера ўсур'ёз:

— Ні за што не пагаджуся ні з тымі камандзірамі, ні з тымі кіраўнікамі прымаючых арганізацый, якія бачаць у дзяўчатах з Беларусі толькі «залаты працоўны фонд Малдавіі». Мы ж прадстаўляем сваю рэспубліку. Таму без талентаў, якія б змаглі працай, песняй, адносінамі да мясцовых жыхароў паказаць традыцыі беларусаў,— не абысціся. А да мяне за месяц працы яшчэ ніхто з байцоў не падышоў з уласнай прапановай. Людзі больш пасіўнымі сталі. Ці што? А можа, для будатрадаўскага руху надышлі якраз тыя часіны, калі на энтузіязме не паедзеш далёка?

З «навічкамі» Ірай Меланінай, Людай Новік, Вольгай Харытановіч і Аленай Модулевай размовы не атрымалася. Убачыла я іх зацікаў меснік сакратара камітэта камсамола па маральна-эстэтычнаму выхаванню — і прапанаваў шанц: «Ёсць вакансія на кіраўніка агітбрыгады».

...Яшчэ б яна не пагадзілася! Знайшла ў атрадзе і музыкантаў, і харэографаў, не адзін раз перапісала першы сцэнарый, прымусіла ўдзельнічаць амаль кожнага байца.

Савет «старых» вынес прысуд:

«На памідорах працаваць зможаш, а вось гарох...»

— Чым мне падабалася «Мара»? Конкурс. Стваралася ён не «выбітымі» заявамі — колькасцю жадаючых. Тры гады выязджалі адным саставам. Для «навічкоў» пакідала каля пяці месц. Каб у «Мару» нехта ехаў грошы на «фірму» зарабляць? Не было такога! Каб студэнт, атрымаўшы «нездавальняюча», напісаў заяву ў атрад? — таксама! Сесію здавалі датэрмінова, ніякіх прывілей не мелі — пераносіць экзамены на восень не дазвалялася. Зразумела, што да выпадковых людзей таксама ставіліся негатыўна. Адпрацаваў семестр байцом у звычайным атрадзе — маеш права на выязны. І яшчэ. У канцы аднаго працоўнага семестра вырашалі, каму быць камісарам і камандзірам у новым. Гэта потым падборам кандыдатур пачаў займацца камітэт камсамола. Калі атрад адмаўляў у рэкамендацыі на наступны год (два-тры такія байцы ўсё ж знаходзіліся), тыя заяў ужо не пісалі: безнадзейная справа.

Мы не мелі прывычку размяркоўваць даручэнні. Кожны прыходзіў на якую-небудзь «пасаду», а брыгадзіраў выбірала кожная брыгада.

Не шанавалі «газетных» традыцый. У нас было дастаткова ўласных: на суботніках зараблялі грошы на будатраданскую форму, перад ад'ездам кватэр'ераў збіраліся ўсе разам, і пасля працоўнага лета сябравалі.

Пра «Мару» сённяшнюю гаворыць Алена з сумнай усмешкай:

— Працуюць дзяўчаты добра, але каранёў моцных ужо няма. Даводзіцца вандраваць з гаспадаркі ў гаспадарку. У нас была свая, амаль родная, Уладзіміраўка. Кіраўніцтва калгаса ведала, чаго не хапае студэнтам у інтэрнаце, і прэміі мы атрымлівалі такія, як тэлевізар у ленінскі пакой, прайгравальнік. Мы ж іначай не прыязджалі, як з цацкамі для вясковай дзятвы, кніжкамі для школы. Мы былі сваімі. Нас чакалі і помнілі.

Без атрада-агітбрыгады, калі кожныя восем чалавек маглі, не зважаючы на «спецыфічнасць», ісці ў суседнюю вёску даваць канцэрт, без фактычнага, а не прапанаванага занальным штабам ленінскага задання, без піянерскай практыкі (дарэчы, многія менавіта з-за яе не змаглі выехаць у атрад, ды й кіраўніцтва факультэта на гэта спасылаецца) у рознаўзроставым атрадзе і кансультацыйным пункце «Мара» не была б «Марай». Нават калі даводзілася адразу займацца афармленнем пакояў, выпускам насценнай газеты, падрыхтоўкай да дзяжурства ў лагеры, работа не магла спыніцца.

— І без песні мы не маглі. Спявалі ў полі і пасля адбою ціхенька спявалі. У кожнай брыгады, як візітная картка,— свае песні. Цяпер жа працавала з «мараўкамі» на дні ўдарнай працы, расчаравалася: спяваюць толькі «старыя». А святы? Не памятаю, каб калі-небудзь было ў нас столькі гледачоў — удзельнічалі ўсе. Так і святкавалі, ператварыўшы лагер у вялікую сцэну.

— Многія лічаць, што мы, «старыя», штучна адасобіліся, нібыта справы да іншых няма нам,— скардзіліся мне Света, Лена, Ларыса і Наташа, дабаўляючы няўпэўнена:

— У нечым мы і самі вінаватыя. Раней без перагародак і ў прамым, і ў пераносным сэнсе жылі. Цяпер сцены гэтых утульных пакойчыкаў узводзяць агароджы непаразумення.

Мы размаўлялі пасля адбою. Паспрабавалі ўспомніць «мараўскія» песні. Пачуўся забараняючы грукат у перагародку.

Раніцай па дарозе на работу запявалі ізноў адны «старыя».

М. ЗАГОРСКАЯ.

РАЗВАЖАННІ БЫВАЛЫХ

Чым больш аднадумцаў, аб'яднаных мэтай: не паесці садавіны ды гародніны, не загарэць, а зарабіць грошай (нічога дрэннага ў такой фармулёўцы не бачу, менавіта зарабіць уласнай працай), тым хутчэй пасябруюць байцы. Моцным будзе атрад. А такіх становіцца ўсё менш. Не адчуваецца маналітнай з'яднанасці нават у тых атрадах, якія лічацца лепшымі. Ва ўмовах Малдавіі да таго ж намнога складаней працаваць. Непрадугледжаныя абставіны: клімат, пры якім лепш адпачываць, чым працаваць у полі, рэжым работы — пакуль прызвычацца да яго нашы байцы, пройдзе амаль палова семестра, мясцовыя ўмовы ў выглядзе «шчодрых» вінаградараў.

А яшчэ існуе сярод студэнтаў меркаванне: выязны атрад у Малдавію — бы пуцёўка ў санаторый на беразе мора. Прайшоў той час, калі зараблялі тут многа грошай, а таму і вельмі перапрацоўвацца няма патрэбы. Працуе прынцып: не зарабіць, дык добра адпачыць. Большасць канфліктаў вырастае з-за такіх вось дробязных, на першы погляд, непаразуменняў.

В. ЖУКАЎ,
камандзір Слабадзейскага
занальнага штаба
студэнцкіх атрадаў.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
6 кастрычніка
Зак. 1631.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М.Г. ЗАГОРСКАЯ.